

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№16(114)

15 лістапада 2013 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

# БЕЛАРУСКІ ТАЛЕНТ-САМАРОДАК

**Алена ПАЛЯКОВА**

***Як зберагаць духоўную ды матэрыяльную спадчыну роднага краю, працуючы ў калгасе і трымаючы вялікую гаспадарку, можна павучыцца ў жыхара вёскі Судзілы Клімавіцкага раёну ды патомнага шляхціца Аляксандра Галкоўскага. Менавіта гэтаму чалавеку і нашаму земляку прысвяціў адмысловы відэасюжэт незалежны тэлеканал Белсат.***

Перадача выйшла пад назвай "Беларускі талент-самародак дае канцэрты, даглядаючы кароў". У ёй распавядаецца пра тое, што Аляксандр Галкоўскі — знакаміты ў сваім рэгіёне чалавек. У сваёй хаце ў вёсцы Судзілы ён зладзіў сапраўдны музей, сабраўшы з ваколіцы старыя прылады сельскагаспадарчай працы, рэдкія абразы, багатую калекцыю народных касцюмаў, ручнікоў, саматканых посцілак і шматлікіх вязаных рэчаў.

Таксама спадар Галкоўскі — вядомы пчаляр, які мае адну з самых вялікіх у раёне пасек. Усяго на ёй больш за восемдзясят вулляў, дзе самы старажытны пчаліны домік застаўся вяскоўцу яшчэ ад прадзеда-шляхціца і мае каля 100 гадоў. Акрамя гэтага Аляксандр Галкоўскі вырабляе валенкі і займаецца пляценнем паясоў, аднавіўшы старую методыку ткацтва.

Сям'я Галкоўскіх трымае вялікую гаспадарку: каня, кароў, авечак ды птушак. Усе сямейнікі прытрымліваюцца думкі, што свае прадукты нашмат смачнейшыя за магазінныя. У спадара Аляксандра трое дзяцей — дачка Дар'я, сыны Захар і Аляксандр. Дачка выконвае зараз абавязкі дырэктара краязнаўчага музея ў Клімавічах.

Аляксандр Галкоўскі — сапраўдны знаўца мясцовага фальклору і самабытны выканаўца архаічных песняў. Праўда, свой талент ён мае магчымасць прадэманстраваць, бадай, толькі ў рабоце. Для збіральнікаў фальклору ён спявае старыя песні, пачутыя ў родных мясцінах, у полі, пасвячы кароў, або падчас працы на калгаснай ферме. У спадара Аляксандра ўнікальны голас ды непаўторная, эмацыйная манера выканання, калі, здаецца, ён цалкам атаясамліваецца з песняю. Пакуль, праўда, талентам вясковага самародка цікавяцца такія ж апантаныя аматары, як і ён. Калі б у Беларусі існаваў конкурс талентаў, як гэта ёсць ва Украіне ці Польшчы, спадар Галкоўскі мог бы стацца, напэўна, адным з фаварытаў творчых змаганняў.

Адзначым, што на сайце тэлеканала Белсат – belsat.eu – для зацікаўленых гледачоў перадачы былі спецыяльна размешчаны дзве песні ў выкананні Аляксандра Галкоўскага — "Эх, як пайду ж я" і жніўная песня "Пшанічанька мая ярая".

# НЯМА ТАГО, ШТО РАНЬШ БЫЛО

***Сёння з цяжкасцю верыцца, што былі часы, калі чыноўнікі маглі казаць пра неабходнасць галоснасці ў іхніх справах, а дзяржаўныя газеты друкавалі вострыя і праблемныя артыкулы. І друкавалі, дарэчы, на беларускай мове. Гэта было яшчэ ў першыя гады кіравання Аляксандра Лукашэнкі. Вось невялікая згадка пра тое, як гэта было:***


С.М. БАРАНАЎ – старшыня Клімавіцага раённага Савета дэпутатаў.

Вытрымка з даклада "Сканцэнтраваць увагу на нявырашаных пытаннях" (газета "Родная Ніва" - №96, 1996 год):

«Сёння трэба прызнаць, што ў раёне пакуль не забяспечана дастатковая галоснасць у рабоце райсавета дэпутатаў і райвыканкама і асабліва вырашэнне такіх вострых пытанняў, як размеркаванне і прыватызацыя кватэр, аздараўленне дзяцей за мяжой, налічэнне заработнай платы, розных узнагароджванняў, прыцягненне да адказнасці кіраўнікоў розных узроўняў, стан злачыннасці ў раёне і г. д.

Нярэдка гэтыя справы вырашаюцца ў цішыні кабінетаў і таму ўзнікаюць канфліктныя сітуацыі, а людзі звяртаюцца за іх вырашэннем у вышэйстаячыя інстанцыі. Каб гэтага было як мага менш, у далейшым патрэбна дакладная арганізацыя інфармавання людзей па пытаннях, якія іх цікавяць, своечасовае і ў поўным аб'ёме выкананне намечанага і абяцанага. Прыклад у гэтай справе павінны паказаць не толькі райвыканкам, але і мы дэпутаты».





# «МЫ ЛЮДЗІ ПАДНЯВОЛЬНЫЯ»

**Алесь ДАШЧЫНСКІ, Радыё Свабода**

***Карэспандэнт Радыё Свабода пагутарыў па тэлефоне з адпраўленым у адстаўку з пасады старшыні Мінскага аблвыканкаму. Спадар Барыс Батура размаўляў на беларускай мове.***

— Добры вечар, Барыс Васільевіч, як вы сябе адчуваеце? Якія Вашы планы, наогул, што Вы збіраецеся рабіць?
— Я адчуваю сябе добра. Я пенсіянер і буду цяпер адпачываць.
— Але ж Вам сказалі прыйсці на «Барысаўдрэў» і працаваць дырэктарам...
— Ну няма такога. Ва ўсякім разе ва ўказе.
— Але ж Лукашэнка сказаў Вам прыйсці і праз тры дні працаваць на «Барысаўдрэве»...
— Я пакуль адпачываю.
— А што там Вам пагражалі, што распачнуць крымінальную справу, пад суд аддадуць, што ёсць нейкія падставы?
— Ну аддадуць, дык аддадуць. Мы людзі паднявольныя, не надта добра сябе адчуваем.
— Але ж Вы лічыце, што гэта нейкія беспадстаўныя закіды на Ваш бок?
— Не, я лічу, што гэта справядліва. Але не толькі мы. Таму дзякуй Вам за тэлефанаванне, на гэтым інтэрвію скончана.
8 лістапада Лукашэнка звольніў кіраўніка Мінскага аблвыканкама Барыса Батуру. Пры гэтым Лукашэнка выступіў з пагрозай крымінальнай справы:




— Батуру вызваліць ад займаемай пасады і накіраваць сюды (у «Барысаўдрэў») кіраўніком. Калі праз тры дні не выйдзе на працу, распачаць крымінальную справу па ім. Калі ён тут не здолее да вясны — завесці крымінальную справу.

# ПЯЦЬ ФАКТАЎ ПРА БАРЫСА БАТУРУ

**Зміцер ПАНКАВЕЦ, Наша Ніва**

**** 1. Быў міністрам яшчэ ў БССР***
Барыс Батура — ветэран чыноўніцкага корпусу. Яму ўжо 66 гадоў. Нарадзіўся ў Ваўкавыску. Скончыў Політэхнічны інстытут. Кар'еру пачаў будаваць у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Напрыканцы існавання БССР нават пабыў міністрам ЖКГ. Да яго гэтую пасаду займаў сённяшні прэм'ер Міхаіл Мясніковіч. Іх звязваюць даўнія сувязі і знаёмства. Потым Батура узначаліў гэтае міністэрства ўжо ў незалежнай краіне. Прычым, меў партфель міністра і пры Кебічу, і пра Лукашэнку. Агулам міністрам ЖКГ Батура прабыў анамальна доўга ад 1987 да 1999.

**** 2. Начальнік Магілёўшчыны***
У свой час (2000 г.), калі Батуру прызначалі кіраўніком Магілёўшчыны, вобласць была ў эканамічнай яме. Аднак за гады кіравання Батуры крызіс атрымалася пераадолець. Вобласць была адной з першых у краіне па ўцягванню замежных інвестыцый, найперш расійскіх. Увогуле, Батура мае добрыя кантакты з расейскімі бізнэсоўцамі. Казалі, што некалі яму ставілі ў віну ў Адміністрацыі прэзідэнта частыя камандзіроўкі ў Расію. За час ягонага знаходжання на пасадзе старшыні аблвыканкаму аблічча Магілёву змянілася толькі ў лепшы бок.

** 3. У жанчын дыханне становіцца больш частым*
На невялікі час з Магілёва Батуру перавялі ў Мінск на пасаду спікера савета рэспублікі. Прайшоў ён туды па «прэзідэнцкай квоце». Былы старшыня Гомельскага аблвыканкама, а сённяшні старшыня Камітэта дзяржкантролю Аляксандр Якабсон так прадставіў Батуру: «Ён імпазантны мужчына, калі жанчыны праходзяць міма, то ў іх дыханне становіцца больш частым». Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына тады папыталася, а ці не перашкодзіць гэта ў працы.
Будучы на пасадзе спікера Батура заклікаў узмоцніць ідэалагічную працу на месцах. Абвінавачваў Еўрапарламент у дыскрымінацыі беларускіх дэпутатаў. Менавіта ён прадстаўляў Беларусь на пахаванні прэзідэнта Польшчы Леха Качынскага.

**** 4. Казаў, што зарабляе 14 мільёнаў***
Праўда, доўга засіджвацца ў парламенце Батуру не атрымалася. Прычым, як паказваюць некаторыя сведчанні, ён сам папрасіўся займаць пасаду старшыні Мінскага аблвыканкама. «Дзякуй прэзідэнту, што адгукнуўся на маю прапанову. Мінская вобласць — адказны ўчастак. Будзем укалваць па поўнай», — сказаў ён тады.
У кастрычніку 2012-га Барыс Батура ў інтэрв'ю тэлеканалу СТВ прызнаваўся, што сам ездзіць на працу на машыне, шафёра не мае, а таксама агучыў заробак. «Ну, нармальны заробак. Дзякуй кіраўніку дзяржавы. Апошнім часам выходзіць дзесьці 14 мільёнаў».
Адзіным сваім хобі Батура называў гульню ў вялікі тэніс. Хаця сам узначальваў федэрацыю валейбола.

**** 5. «Я нічога не планую, у нас прэзідэнт усё плануе»***
За час працы «губернатарам» Міншчыны Батура запомніўся лабіраваннем інтарэсаў кітайскай тэхналагічнага парку пад Смалявічамі, праціўнікаў жа называў «пячорным людзьмі». Размаўляючы з мясцовымі жыхарамі ў 2012 годзе ён сказаў наступную фразу: «Я не гаспадзін, я — таварыш».
Хаця гэта не адзіны афарызм ад чыноўніка. Яшчэ быўшы на пасадзе старшыні Магілёўскага аблвыканкама Батура сказаў цікавую фразу: «Я нічога не планую. У нас прэзідэнт усё плануе».

# НА БЕЛОРУССКИХ ВЫБОРАХ СЧИТАЮТ И ЭКОНОМЯТ

Сергей АРЖАНЦЕВ

***Сейчас уже известно, что выборы в местные Советы должны пройти не позднее 25 марта 2014 года. Таким образом, они состоятся в следующем году, скорее всего, весной. Тем временем, в некоторых районах уже началась подготовка к будущей избирательной кампании.***




Так уже в первой половине октября в государственных региональных СМИ можно было встретить упоминания о начавшейся подготовке к выборам. Об этом, например, сообщила хотимская районная газета «Путь Октября», проинформировавшая своих читателей о состоявшейся сессии Хотимского районного Совета депутатов. Среди ряда других вопросов на сессии депутаты райсовета приняли решение об определении количества избирательных округов и среднего количества избирателей в округах на предстоящих выборах в Хотимском районе. Было определено 25 избирательных округов со средней численностью 376 избирателей на избирательный округ.

Похожее информационное сообщение также разместила районная газета «Петрыкаўскія навіны». Из него можно узнать, что на сессии Петриковского районного Совет депутатов установили, что к будущим выборам предполагается создать 33 избирательных округа со средней численностью избирателей в каждом округе - 766.

Нечто подобное происходит и в Климовичском районе. Ещё 2 октября в местной районной газете «Родная ніва» появилась небольшая заметка под названием «Время считать и экономить». В ней рассказывается об итогах сессии Климовичского районного Совета депутатов. В основном обсуждались вопросы социально-экономического характера, результаты Года бережливости и т. п. Но если внимательно прочитать текст, то в конце заметки можно обнаружить абзац, содержание которого не связано с экономической проблематикой. Воспроизводим его дословно:

«В соответствии со статьёй 15 Избирательного Кодекса Республики Беларусь решением Климовичского районного Совета депутатов в районе создано 38 избирательных округов со средней численностью 532 избирателя на избирательный округ по выборам депутатов в Климовичский районный Совет депутатов двадцать седьмого созыва».

Таким образом, и в Климовичском районе тоже начали подготовку к выборам. По не вполне понятным причинам власти как в Климовичах, так и по всей стране не стремятся акцентировать внимание избирателей на этом событии. Более того, зимой этого года председатель Центризбиркома Ермошина заявила в эфире телеканала «Беларусь 1», что не исключает, что в Беларуси могут быть отменены выборы в сельские и поселковые Советы депутатов. По её мнению, нужно разобраться, «надо ли сохранять сельские и поселковые Советы в силу того, что там очень тяжело найти кандидатов в депутаты и потом обеспечивать работу этих представительных органов, которые обладают весьма небольшими полномочиями». Одновременно Лидия Ермошина предлагала сократить отдельные избирательные процедуры, благодаря чему «выборы будут проходить на 30% дешевле».

Видимо, действительно, настало «время считать и экономить». Финансов в стране всё меньше, поэтому на сегодняшних белорусских выборах нужно считать не только избирательные бюллетени, но и деньги на их проведение. А заодно искать возможности, как сэкономить растущие затраты и расходы.

***НОВОСТИ РЕГИОНА***


## ПЕРЕЖИТЬ ЗИМУ

***В сельской местности Могилёвщины планируют открывать дома сезонного проживания. Пожилые люди из отдаленных или малонаселенных деревень смогут переселиться на зиму в один из свободных домов центральной усадьбы. Благодаря этому сельским старикам будет легче пережить зимний период, когда из-за снежных заносов в дальние деревни не могут добраться медики и автолавки. Проблема требует решения, ведь количество пожилых людей стремительно растёт. В Климовичском районе из 10 тысяч сельских жителей более 3 тысяч — пенсионеры.***

## ОБОГРЕЮТ ЩЕПКАМИ?



***В конце октября республиканская «Народная газета» поместила заметку «ОтЩЕПили мегаватты». Из неё можно узнать, что УКП «Коммунальник» Климовичского района приобрело котёл отечественного изготовления мощностью в два мегаватта, работающий на щепе. Газета пишет, что переход котельной на щепу дал немалый эффект. Кроме того, климовичским читателям сообщается, что «сейчас жители микрорайонов ПМК, "Гаранта" и КСМ будут обеспечены круглогодично горячей водой». Что ж, как говорится, ловим на слове!***



# ПЛАНЫ ПО СТРОИТЕЛЬСТВУ ЖИЛЬЯ ПРОВАЛЕНЫ

## *По итогам девяти месяцев задание по вводу жилья не выполнено и на 60%*

Тимур НЕЗВАНОВ

***За девять месяцев текущего года в Беларуси было введено в эксплуатацию менее 60% жилья, предусмотренного годовым заданием. Если точнее, то на 1 октября 2013 г. строители сдали 3,75 млн. квадратных метров общей площади жилья, или 57,7% к плану на этот год. Но эти данные характеризуют ситуацию в целом по стране. В разрезе же отдельных областей положение обстоит гораздо хуже.***

В связи с этим уместно напомнить, что ещё месяц назад Правительство Беларуси раскритиковало ход выполнения программы жилищного строительства на 2013 год. На заседании президиума Совета министров для его участников были озвучены неприятные цифры. В докладе премьер-министру Михаилу Мясниковичу говорилось, что за прошедшие 8 месяцев намеченные жилищные планы выполнены лишь наполовину. Наиболее низкие показатели на тот момент имели Витебская и Гомельская области, которые смогли выполнить доведенное годовое задание всего на 29,6% и 35,7% соответственно.

Присутствующим на президиуме напомнили, что согласно постановлению Совета министров № 1023 от 6 ноября 2012 года «О мерах по выполнению заданий на 2013 год по строительству жилых домов» планы по вводу жилья предусматривают введение 6,5 млн. кв. м. Но с такими темпами надеяться на выполнение запланированных показателей явно не приходится. Теперь же, спустя месяц, это стало ещё более очевидно.

О чём свидетельствует провал жилищных планов Правительства? В первую очередь, о том, что строительный бум в Беларуси подходит к своему завершению. Жить за взятые по всему миру миллиардные кредиты больше не получится. А это означает, что для нашей страны заканчиваются времена грандиозных строек, доступного жилья и дешёвой коммуналки. Идя три года назад на президентские выборы, Лукашенко обещал белорусам, что после его победы будут ежегодно строить 10 миллионов квадратных метров жилья. Эти обещания навсегда остались в прошлом, во всяком случае, пока у нас будет этот президент.

Также сворачивание жилищных программ указывает на то, что Беларусь окончательно теряет свой привлекательный имидж социального государства. В реальности это особенно затронет тех граждан, кто получает или строит жильё с государственной поддержкой. Отметим, что сегодня и так преобладающим источником финансирования жилищного строительства в Беларуси являются собственные средства населения. А в перспективе, учитывая состояние экономики, нуждающиеся в улучшении жилищных условий за редким исключением будут рассчитывать только на себя.

Обратимся к статистическим данным, характеризующим ситуацию на местном уровне. В 2011 г. в Климовичском районе было введено в эксплуатацию 15,3 тыс. кв. м жилья. А уже в следующем 2012 году смогли построить только 6,2 тыс. метров квадратных общей площади жилых домов. Чтобы исправить положение, на этот год району было доведено задание — 10,1 тыс. кв. м. жилья. Но выполнение задания оставляет желать лучшего. Так, за январь-сентябрь отчитались только за 4752 м., что существенно меньше, чем было достигнуто в прошлом году за соответствующий период (6116 м.).

И подобные кризисные тенденции легко обнаруживаются не в одном только Климовичском районе, аналогичный спад наблюдается в большинстве райцентров и областных городах. К примеру, вот что писали в октябре о стройках Могилёва в «Могилёвских ведомостях»: «С большими трудностями идёт город к выполнению задания по строительству жилья: при годовом плане в 230 тысяч кв. м. за 9 месяцев введено в эксплуатацию 96,4 тысячи кв. м.». А про «большие трудности» Бобруйска без прикрас высказался сам глава области Пётр Рудник: «Особенно это касается Бобруйска, где строительная отрасль находится почти на грани развала: за последние четыре года работы город на Березине ни разу не выполнил доведенное задание по строительству жилья» (цитируется по mogilevnews.by).

В самом начале нашего материала, говоря о том, что за девять месяцев в стране ввели в эксплуатацию менее 60% жилья от годового задания, мы упомянули, что в разрезе отдельных областей



положение обстоит гораздо хуже. Это было сказано и про Могилёвскую область. По итогам работы за январь-сентябрь на Могилёвщине введено в строй лишь 47,2% от годового задания по строительству жилья. Мы специально подчёркиваем этот факт по следующей причине.

Как раз тогда, когда были обнародованы провальные «достижения» Могилёвской области, Александр Лукашенко назначил нового министра архитектуры и строительства РБ. Во вторник 15 октября им официально стал Анатолий Борисович Черный. До этого Анатолий Черный работал заместителем и первым заместителем председателя Могилёвского облисполкома. На предыдущей должности отвечал за жилищную политику области, развитие её строительного комплекса и ЖКХ. Судя по перечисленным выше статистическим данным, результаты его работы налицо.

Осталось только поздравить страну и президента с удачным назначением?





# С ДИАБЕТОМ ЖИЗНЬ НЕ САХАР

Светлана ОСМОЛОВСКАЯ

***Всемирный день борьбы против диабета отмечается 14 ноября. Дата установлена в день рождения канадского физиолога Фредерика Бантинга, который совместно с профессором Джоном Маклеодом открыл гормон инсулина. В 2006 году по этому поводу была принята резолюция Генеральной Ассамблеи ООН, подкрепившая общественное начинание своим авторитетом. Количество больных диабетом растёт, так что бороться с заболеванием нужно всем миром.***

Диабет — заболевание, связанное с недостатком в организме человека инсулина или снижением его действия. Печень и мышцы теряют способность превращать поступающий сахар в гликоген. Сахар перестаёт усваиваться организмом, в результате чего нарушаются все виды обмена веществ.

Факторами риска развития этого заболевания являются нарушение питания, низкая физическая активность, избыточная масса тела, а также генетическая предрасположенность. В происхождении диабета большую роль играет наследственность, поэтому он относится к наиболее распространённым хроническим заболеваниям. Если двадцать лет назад количество людей с диагнозом «сахарный диабет» во всём мире не превышало 30 млн., то сегодня количество таких пациентов составляет 300 млн. Чтобы противостоять этой проблеме, несколько лет назад в Беларуси начали производить собственные генно-инженерные инсулины. Сегодня 80% препаратов, используемых белорусскими диабетиками, отечественного производства.

Кстати, очень важно установить, подходит ли заболевшему тот или иной конкретный препарат. Не всякому диабетику годится белорусский инсулин, в этом случае врач может прописать ему импортный. Однажды случайный попутчик в поезде делился переживаниями, как мучился во время лечения. Не помогали ни усиленная диета, ни строгий приём инсулина. По совету поехал в Борисовский медцентр, где прошёл анализы. Пожилой врач-еврей спросил: «Что принимаете сейчас?». И узнав, сказал: «Выкини в окно, тебе не поможет. Наше средство не всем помогает, тебе нужен другой вид инсулина». Стал доставать польские лекарства, после этого прежних проблем не возникало, организм нормализовался.

У нас в Беларуси также увеличивается число больных сахарным диабетом, что подтверждают данные Минздрава. На начало 2012 на диспансерном учёте находилось 219 тысяч пациентов с диабетом, в 2013-м — 240 тысяч. Ежегодный прирост количества больных составляет 8-10%, каждый год выявляется 20-22 тыс. заболевших. В Климовичском районе в настоящее время проживает 500 диабетиков, среди них есть дети и подростки. В помощь населению при Климовичской ЦРБ были открыты «Школа диабета» и «Школа диабетической стопы».

# ЗОЛОТОВАЛЮТНЫЕ РЕЗЕРВЫ РУХНУЛИ НА 575 МИЛЛИОНОВ ДОЛЛАРОВ

Вадим ЛИВНЕВ, Салідарнасць

По итогам октября золотовалютные резервы (ЗВР) Беларуси в международном определении рухнули сразу на 574,6 миллиона долларов и, по предварительным данным, составили на 1 ноября 6,813 миллиарда долларов. В национальном определении объём ЗВР уменьшились почти на такую же сумму — 560 миллионов долларов.



Масштабы сокращения золотовалютных резервов растут от месяца к месяцу.

За июль 2013 года ЗВР Беларуси в международном определении уменьшились на 101 миллион долларов.

За август — на 215 миллионов долларов.

За сентябрь — на 313 миллионов долларов.

За октябрь — на 575 миллионов долларов.

Тенденция, однако.

В 2011 году сокращение золотовалютных резервов предшествовало рекордной девальвации белорусского рубля. Так что, столь стремительное уменьшение ЗВР является косвенным признаком того, что очередной резкий обвал национальной валюты может грянуть в любой момент.

***НОВОСТИ РЕГИОНА***

## НУ, ЗА ВЬЕТНАМ!




***Климовичский ликеро-водочный завод намерен покорить своей продукцией далёкий Вьетнам. Предприятие уже заключило первый контракт на поставку 3 тысяч декалитров климовичской водки. Это первая пробная поставка, которая проводится с целью изучения спроса на рынке. Для вьетнамских потребителей приготовлены сорта водки известных и проверенных брендов — «Казенная», «Березуха» и «Медведев». Также в планах ЛВЗ открыть во Вьетнаме совместное производство по выпуску алкогольной продукции под торговой маркой «Климград».***

## ПОЛНЫМ ПОЛНО

***Климовичский район продолжает бить рекорды по затоваренности складов. За август складские запасы промышленных предприятий района потянули в общей сложности на 70 миллиардов рублей. А уже к началу октября эта сумма выросла почти до 84 миллиардов. Для сравнения: запасы промышленной продукции на складах Костюковичского района оцениваются в 20 млрд. руб., Кричевского района — 69,6 млрд. руб.***



# УБОРКА В ПАРКЕ — ЗАЧЕМ ЭТО НАДО?

Михаил ПЕТРОВ

***Не так давно республиканская газета «Белорусская нива» напечатала письмо жительницы Климовичского района Татьяны Н. Она спрашивала редакцию: «Услышала от знакомой, что уборка листьев с повреждённых газонов и в парках вредна для почвы. Так ли это?» Для климовчан подобный вопрос понятен, ведь каждую осень в городе проходит добровольно-принудительная уборка городского парка.***

Ответ для «Белорусской нивы» подготовил учёный секретарь Института леса Национальной академии наук Беларуси, кандидат сельскохозяйственных наук Иван Бордок. Вкратце его заключение сводится к следующему выводу: «Когда речь идёт о вытоптанных, пострадавших насаждениях, уборка листвы приносит только вред, снижает содержание питательных веществ в почве. Таким образом, гумус (органическое вещество почвы) не поступает в землю, полностью разрушается лесная «подстилка» — непременное условие «жизнедеятельности» деревьев в парках. Там уборка листвы — затратная и неоправданная с любой точки зрения затея».

Специалист рекомендует убирать дорогие газоны, из разряда тех, которыми, например, засаживают футбольные поля. Что же касается территории обычных парков, то они в уборке не нуждаются. А ведь у нас в Климовичах привлекают десятки людей, чтобы собрать и загрузить опавшую листву. В октябре и ноябре городской парк поочерёдно прочёсывают граблями самые различные организации — от районного узла связи до отдела образования.

Заинтересовавшись темой, стал искать дополнительную информацию в интернете. В "Комсомольской правде" на аналогичный запрос эксперт разъяснил: «Убирать листья — глупо. Листва даёт перегной, и деревья, от которых её не сметают, живут в 1,5 - 2 раза дольше». А в газете «Рэспубліка» представитель УП «Минскзеленстрой» объяснил: «Чтобы сохранить естественный лесной покров, мы тоже не убираем листву в парках и скверах. Очищаем только дорожки и землю возле них на 2—5 метров, потому что дует ветер и листья мешают ходить. Люди могут поскользнуться и упасть. На остальной территории парков подстилку листьев оставляем».

Так что перед очередной зачисткой парка в Климовичах не помешает сделать выбор. Что важнее — эстетика или экология?

## ПЛАНАВАНЫ ПАДАТАК НА «ДАРМАЕДАЎ» — 280 ДАЛЯРАЎ ЗА ГОД

***У Беларусі падрыхтаваны праект дзяржаўнага рашэння, якое прадугледжвае спагнанне платы з грамадзян, якія не працуюць і не ўдзельнічаюць у фарміраванні даходнай часткі бюджэту шляхам выплаты падаткаў, але з'яўляюцца спажыўцамі сацыяльных паслуг. Вось што аб гэтым паведамляе Interfax.by.***




«Цяпер ва ўрадзе разглядаецца пытанне аб устанаўленні для грамадзян, якія не ўдзельнічаюць у фарміраванні даходнай часткі бюджэту шляхам выплаты падаткаў, бо яны нідзе фармальна не працуюць, але тым не менш карыстаюцца сацыяльнымі выгодамі, якія фінансуюцца з бюджэту», — заявіла начальнік галоўнага кіравання фінансавання сацыяльнай сферы і навукі Міністэрства фінансаў Беларусі Святлана Крэтава ў аўторак у беларускім парламенце.

Плануемы «падатак на дармаедаў» складзе 2,6 мільёна рублёў на год — гэта каля 280 даляраў па сённяшняму курсу.

Паводле падлікаў прэм'ера-міністра Міхаіла Мяніковіча, у Беларусі налічваецца каля 500 тысяч чалавек, якія нідзе не працуюць, але не становяцца на ўліку па беспрацоўю. Калі сабраць грошы з кожнага з іх, бюджэт атрымае дадатковыя 140 мільёнаў даляраў.

## УРАД ПРАПАНУЕ ЗБІРАЦЬ З КОЖНАГА АЎТАМАБІЛІСТА ПА 500 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

***Гэта будзе пошліна за допуск аўтамабіля да дарожнага руху, інфармуе сайт nn.by.***

Прапановы ўрада аб падатковай палітыцы на 2014 год прадугледжваюць магчымасць увядзення пошліны за допуск аўтамабіля да дарожнага руху.

Паводле словаў намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі міністэрства фінансаў Алега Селіверстава, плацёж будзе разовым і сплачвацца як з грузавікоў, так і з легкавікоў.

Урад мяркуе, што пошліна будзе складаць 3-5 базавых велічыняў на год. Гэта 390-650 тысяч рублёў.

На пачатак года ў краіне было зарэгістравана 3 817 792 транспартных сродкаў.

Калі б уласнікі кожнага з іх сплацілі па 500 тысяч рублёў, дзяржава б атрымала каля 200 мільёнаў даляраў.







# АПОШНІ ПРАДПРЫМАЛЬНІК

Сяргей ПУЛЬША, Новы Час

***Колькі ўжо разоў Аляксандр Рыгоравіч кляўся і бажыўся пацiснуць руку апошняму прадпрымальніку! Як толькі іх ні душылі: і падаткамі, і арэндай, і праверкамі, і сертыфікатамі, і ліцэнзаваннем…***



Зразумела, прадпрымальнікі ўжо даўно не чакаюць ад беларускай улады нічога добрага. Зараз прадпрымальнікам нанеслі чарговы ўдар у спіну.

Нагадаем, тэхрэгламент Мытнага саюза, згодна з якім тавары лёгкай прамысловасці мусяць праходзіць абавязковую сертыфікацыю, павінен быў уступіць у дзеянне з 1 чэрвеня гэтага года. Але прадпрымальнікі справядліва наракалі на тое, што працэдура сертыфікацыі вельмі дарагая і грувасткая. Да таго ж, чамусьці праходзіць яе ў Беларусі павінны менавіта прадпрымальнікі, а не вытворцы прадукцыі, у якіх прадпрымальнікі закупаюцца. І плаціць за гэтую сертыфікацыю павінен таксама прадпрымальнік.

Чамусьці вытворцы тавараў лёгкай прамысловасці краін ТС гэты тэхрэгламент не праходзяць. Не праходзяць яго буйныя аптавікі, напрыклад, Масквы, дзе «затарваюцца» беларускія ІП. Не праходзяць працэдуру тэхрэгламента і прадпрымальнікі Расіі і Казахстана — нягледзячы на тое, што і яны таксама ў Мытным саюзе. А вось нашы чыноўнікі вырашылі што беларусы павінны быць вельмі законапаслухмянымі.

Улетку гэтага года прадпрымальнікі ўжо выказалі сваё меркаванне з нагоды тэхрэгламента ў ходзе папярэджальнага страйку, які адбыўся 27 чэрвеня на многіх рынках і гандлёвых цэнтрах краіны. Страйк ахапіў шэсць абласных і 20 раённых цэнтраў, дзе пражывае 75% гарадскога насельніцтва краіны. У выніку ўрад крыху адумаўся: да 1 лістапада прадпрымальнікам дазволілі гандляваць і без тэхрэгламенту, а да 1 ліпеня 2014 года пакінулі спрошчаны парадак пацвярджэння адпаведнасці прадукцыі тэхрэгламенту.

Прадпрымальнікі сталі чухаць патыліцы над тым, як перайсці на новыя рэйкі працы. Але, як кажуць, «вераломна, без абвяшчэння вайны» не хто іншы, як старшына Савета па развіцці прадпрымальніцтва Пётр Пракаповіч заявіў, што выконваць тэхрэгламент прадпрымальнікі павінны будуць ужо з 1 снежня 2013 года. Маўляў, усё для гэтага ўжо гатова, засталося толькі ўнесці праўкі ў заканадаўства.

Гэта нягледзячы нават на тое, што за беларусаў заступілася Еўразійская эканамічная камісія. Яна выказалася ў тым рэчышчы, што ў Беларусі «неабгрунтавана пашырана вобласць прымянення» тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы прадукцыі лёгкай прамысловасці». Гэта зафіксавана ў выніковым пратаколе першага сумеснага пасяджэння падкамітэтаў ЕЭК, якое прайшло 2 жніўня ў Маскве.

На гэтым пасяджэнні выступіла спецыяліст дэпартамента тэхнічнага рэгулявання ЕЭК, саветнік аддзела тэхнічных распрацовак Антаніна Галаўцова, якая заявіла, што суб'ектамі рэгулявання тэхрэгламентаў з'яўляюцца толькі дзве катэгорыі — імпарцёры і вытворцы, а ніяк не раздробны гандаль. Такім чынам, прадпрымальнікі ўвогуле пад тэхрэгламент не падпадаюць. Але беларускі ўрад спрабуе прымусіць прадпрымальнікаў плаціць за тое, што іх не тычыцца.

Чаму так робіцца? Зразумела, знішчаючы прадпрымальнікаў, урад імкнецца разгрузіць склад Урадавыя аналітыкі, верагодна, лічаць, што напярэдадні навагодніх святаў адсутнасць на рынках звыклага асартыменту прымусіць беларускіх грамадзян купляць дарагія аналагі мясцовай вытворчасці, што станоўча адаб'ецца на колькасці складскіх запасаў. Аднак наўрад ці ўсе тыя, хто не знойдзе патрэбны тавар на рынку, адразу кінуцца «купляць беларускае». Хутчэй, вельмі ўдалыя часы чакаюць літоўскія і польскія гандлёвыя цэнтры. «Озасы» і «Акропалісы» могуць спадзявацца на наплыў беларускіх пакупнікоў, якія будуць вывозіць валюту з краіны, каб закупіцца навагоднімі падарункамі на тамтэйшых распродажах.

А беларускія прадпрымальнікі з 1 снежня 2013 года могуць проста вымушана спыніць працу. Тое, што яны спыняць працу, не сумняваецца амаль ніхто. Напрыклад,старшыня Каардынацыйнага савета прадпрымальнікаў Мінска Алесь Макаеў кажа, што ўвядзенне тэхрэгламенту проста робіць немагчымай працу прадпрымальнікаў. «Тут альбо спыненне працы, бо ніякага часу і грошай не хопіць на тое, каб сертыфікаваць кожную партыю тавару ў колькасці пяці штук, альбо праца па-за межамі закона: без папераў і дакументаў. А гэта можа балюча адгукнуцца самім прадпрымальнікам», — лічыць Макаеў.

Што ж тычыцца аргумента кшталту «разгрузкі складоў», то Макаеў не ўспрымае яго ўсур'ёз. «Паглядзіце, з кожным годам павялічваецца колькасць цягнікоў і аўтобусаў, якія ідуць у напрамках Польшчы, Літвы, Украіны. Што, нашы людзі масава едуць адпачываць туды на адзін-два дні? Да таго ж кожны можа паглядзець у інтэрнэце, якія штодня чэргі праз мяжу на літоўскім і польскім напрамках. Гэта само за сябе кажа, што і дзе набываюць нашы грамадзяне», — адзначае прадпрымальнік.

Спыненне ж працы прадпрымальнікаў моцна ўдарыць не толькі па грамадзянах, якія ламануцца праз мяжу, і, адпаведна, па мытніках і памежніках. І не толькі створыць напружанасць у аддзелах па беспрацоўі, куды прадпрымальнікі пойдуць «шчыльнымі радамі». Гэта яшчэ раз ударыць па і без таго ўбогім бюджэце краіны.

Два тыдні таму прэс-служба Міністэрства па падатках і зборах з задавальненнем адзначала, што толькі ў Мінску паступленні падаткаў і збораў ад індывідуальных прадпрымальнікаў за дзевяць месяцаў 2013 года выраслі на 42,5%. Па стане на 1 кастрычніка на ўліку ў падатковых органах Мінска знаходзілася 68 118 індывідуальных прадпрымальнікаў, ад якіх паступіла падаткаў і збораў на 683,9 мільярда рублёў. Такім чынам, толькі прадпрымальнікі Мінска здалі ў бюджэт каля 75 мільёнаў долараў.

Калі хаця б палова з прадпрымальнікаў спыніць працу 1 снежня, то за месяц прыйдзецца істотна скарэктаваць бюджэт краіны на ўсё яшчэ бягучы год. А бюджэт–2014 увогуле можна лічыць банкрутам.





# «БЕЛАРУСЬ — ФУТБОЛЬНЫЙ КАРЛИК»

Причин нынешнего состояния отечественного футбола, близкого к плачевному, немало. На одну из причин указал журналист «Прессбола» Борис Тасман в статье «Глубинная дыра», где речь идёт об отечественных чемпионатах: «Если первая лига (Д2) выглядит относительно благополучно (16 команд играют в два круга), то вторая (Д3), безусловно, огорчает: всего 13 дружин. В сумме у нас — 41 команда на всю 9-миллионную страну. Например, в Чехии, сравнимой с Беларусью по численности населения (10,5 млн. человек в Чехии против 9,4 — у нас), в пяти дивизионах играют 306 команд. В Финляндии (5,4 млн. человек) в семи лигах — 830! Не меньше впечатляет трёхсоттысячная Исландия — 59 дружин в четырёх лигах!

Приходится признать: Беларусь — футбольный карлик, не имеющий морального права замахиваться на выход в финальные стадии топ-турниров».

# УКРАИНА ОТМЕНИЛА ВСЕОБЩУЮ ВОИНСКУЮ ПОВИННОСТЬ

Президент Украины Виктор Янукович подписал приказ об отмене всеобщей воинской обязанности и переходе на контрактный принцип формирования вооружённых сил.

Таким образом, стартовавший 1 октября осенний призыв станет для украинских военнослужащих-срочников последним. На момент подписания приказа украинская армия уже была укомплектована контрактниками на 50%.

Подписав приказ, Янукович отметил, что украинская армия нуждается в профессиональных кадрах. «Техника очень сложная, поэтому армия сейчас должна быть профессиональная. Эти военные профессионалы должны обеспечить безопасность нашего государства», — подчеркнул президент Украины, сообщает «Коммерсантъ».

# ІНТЭРНЭТ-БІБЛІЯТЭКА KAMUNIKAT.ORG: БОЛЬШ ЗА 13 000 БЕЛАРУСКІХ ВЫДАННЯЎ

Праект “Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org”, які рэалізуе Беларускае гістарычнае таварыства, існуе з 2000 году і арыентаваны на збор незалежных беларускіх выданняў. На сайце www.kamunikat.org можна знайсці кнігі, газеты, аўдыё і відэа. Усяго размешчана больш за 13 000 розных выданняў. А ў раздзеле “Перыёдыка” знаходзяцца ўсе нумары “Клімавіцкай Інфа-Панарамы” за 2012 і 2013 год.



kamunikat

Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

# Д-Л-И-Н-Н-Ы-Й АНЕКДОТ

Америка. Пустынная прерия. Скоро полночь. Около пустого шоссе среди песков и кактусов стоит маленькая гостиница — единственное строение на несколько миль вокруг. Все места заняты. К гостинице подъезжают три студента и начинают стучать в дверь. Выходит хозяин. Студенты:

— Нам бы переночевать…

— У меня все номера заняты; есть только одна комнатушка: 6 метров, без окон, без мебели, стены не покрашены, холодно, сыро, крысы.

— Ну, мы же студенты — люди привычные. Для одной ночи сойдёт.

Хозяин их впускает, они заходят в комнату, дверь закрывается.

Полночь. К гостинице на лошадях прискакивают три ковбоя. Стучатся в дверь, хозяин открывает.

— Впусти, друг, переночевать.

— Я бы вас впустил, но у меня все номера заняты; есть только одна комнатушка: 6 метров, без окон, без мебели, стены не покрашены, холодно, сыро, крысы, да и то там уже три студента.

— Да ладно тебе — мы же ковбои, мы с ними договоримся.

Хозяин впускает ковбоев, они заходят в комнату, дверь закрывается.

Час ночи. К гостинице на лимузине подъезжают 3 мафиози. Стучатся в дверь, хозяин открывает.

— Нам бы, браток, ночку перекантоваться у тебя…

— Я бы вас впустил, но у меня все номера заняты; есть только одна комнатушка: 6 метров, без окон, без мебели, стены не покрашены, холодно, сыро, крысы, да и то там уже три студента и три ковбоя.

— Братан, мы же мафия. Разберёмся, какие проблемы.

Хозяин их впускает, они заходят в комнату, дверь закрывается.

Два часа ночи. К гостинице на дорогущем автомобиле подъезжает сногсшибательная блондинка. Стучится в дверь, хозяин открывает.

— Мистер, мне бы переночевать…

— Я бы вас впустил, но у меня все номера заняты; есть только одна комнатушка: 6 метров, без окон, без мебели, стены не покрашены, холодно, сыро, крысы и ещё там уже спят три студента, три ковбоя и три мафиози…

— Я разберусь с ними, как истинная женщина.

Хозяин впускает. После чего не может уснуть всю ночь: 6 метров, без окон, без мебели, стены не покрашены, холодно, сыро, крысы, три студента, три ковбоя, три мафиози, блондинка… Что же завтра будет?!

Утром из комнаты выходят три студента, довольные жизнью, покупают три Кока-Колы и уезжают. Затем выходят три ковбоя, довольные жизнью, покупают три Кока-Колы и уезжают. После выходят три мафиози, довольные жизнью, покупают три Кока-Колы и уезжают. Последней выходит блондинка, ещё краше, чем ночью, покупает виски, выпивает и уезжает.

Вывод: 9 из 10 человек в Америке пьют Кока-Колу.






КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

*Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь*
*Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр’евіч*
*Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.*
*Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў*
*Распаўсюджваецца бясплатна*